22130020

International Baccalaureate®
Baccalauréat International
Bachillerato Internacional

**BELARUSIAN A: LITERATURE – STANDARD LEVEL – PAPER 2**
**BIÉLORUSSE A : LITTÉRATURE – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 2**
**BIELORRUSO A: LITERATURA – NIVEL MEDIO – PRUEBA 2**

Monday 13 May 2013 (morning)
Lundi 13 mai 2013 (matin)
Lunes 13 de mayo de 2013 (mañana)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

---

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Answer one essay question only. You must base your answer on at least two of the Part 3 works you have studied and compare and contrast these works in response to the question. Answers which are not based on a discussion of at least two Part 3 works will not score high marks.
- You are not permitted to bring copies of the works you have studied into the examination room.
- The maximum mark for this examination paper is *[25 marks]*.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Traitez un seul sujet de composition. En basant votre réponse sur au moins deux des œuvres de la troisième partie que vous avez étudiées, vous devez comparer et opposer ces œuvres dans le cadre du sujet. Les réponses qui ne sont pas basées sur au moins deux des œuvres de la troisième partie n'obtiendront pas une note élevée.
- Vous n'êtes pas autorisé(e) à apporter des exemplaires des œuvres que vous avez étudiées dans la salle d'examen.
- Le nombre maximum de points pour cette épreuve d'examen est *[25 points]*.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Conteste una sola pregunta de redacción. Base su respuesta en al menos dos de las obras estudiadas de la Parte 3, comparándolas y contrastándolas en relación con la pregunta. Las respuestas que no se basen en al menos dos obras de la Parte 3 no recibirán una puntuación alta.
- No está permitido traer copias de las obras estudiadas a la sala de examen.
- La puntuación máxima para esta prueba de examen es *[25 puntos]*.


© International Baccalaureate Organization 2013

*Напішыце эсэ на* ***адну*** *з наступных тэм. Вы павінны заснаваць свой адказ* ***сама меншае на двух творах*** *часткі 3, якія вы вывучалі. Параўноўвайце і супастаўляйце гэтыя два творы ў вашым адказе на пытанне. Адказы, якія* ***не*** *засноўваюцца на двух творах часткі 3,* ***не*** *будуць высока ацэньвацца.*

**Раманы і Аповесці**

**1.** “Прынята лічыць, што ў кожным рамане ёсць апавядальнік, які можа не ўдзельнічаць у падзеях твора або быць адной з дзейных асоб. Адрозніваюць ‘аповед ад першай асобы’, або ‘я-аповед’, і ‘аповед ад трэцяй асобы’, дзе ніякага ‘я’ няма.” Звяртаючыся як мінімум да двух раманаў з ліку тых, што вы вывучалі, патлумачце, якім чынам спосаб аповеду можа выкарыстоўвацца для стварэння героя (вобраза-персанажа).

**2.** Падзеі, апісаныя ў раманах, могуць разглядацца з перспектывы таго часу, калі яны маюць месца, а таксама з перспектывы крыху больш позняга або нашмат больш позняга часу. Звяртаючыся як мінімум да двух раманаў з ліку тых, што вы вывучалі, прааналізуйце, якім чынам перспектыва часу дапамагае аўтарам данесці да чытача свае найважнейшыя ідэі.

**3.** “Вядомая рэч, што раман – гэта аснова кожнай літаратуры. У рамане пэўным чынам адлюстроўваецца ўладкаванне свету; ён дае магчымасць аналізаваць і супастаўляць учынкі людзей.” У якой ступені адпавядаюць гэтаму ўяўленню пра раман як мінімум два творы гэтага жанру з ліку тых, што вы вывучалі?

**Апавяданні**

**4.** “Дзеля таго, каб быць паспяховым, аўтар апавядання павінен карыстацца амаль што ўсімі тымі элементамі, якія ўжывае аўтар рамана, толькі на значна меншай колькасці старонак.” Звяртаючыся як мінімум да двух апавяданняў розных аўтараў з ліку тых, што вы вывучалі, патлумачце, наколькі вы згаджаецеся альбо не згаджаецеся з гэтым сцверджаннем. Ці існуе больш істотная розніца паміж апавяданнем і раманам?

**5.** Ці могуць быць “сапраўдныя героі” ў апавяданнях? На прыкладзе апавяданняў, якія вы вывучалі, патлумачце ролю, якую адыгрываюць у іх галоўныя героі.

**6.** Спасылаючыся на апавяданні, якія вы вывучалі, патлумачце, якое значэнне маюць апісанні абстаноўкі ў апавяданнях.

**Паэзія**

**7.** Джон Сцюарт Міль пісаў, што “паэзія – гэта знянацку пачутыя словы”. На падставе паэтычных твораў, якія вы вывучалі, сфармулюйце сваё стаўленне да гэтага выказвання.

**8.** На падставе паэтычных твораў, якія вы вывучалі, паспрабуйце разгорнута патлумачыць, якім чынам паэты дэманструюць сваё асаблівае бачанне свету.

**9.** Звяртаючыся да прачытаных вамі некалькіх паэтычных твораў, патлумачце, якую ролю адыгрывае рытмічная арганізацыя кожнага з іх.

**П’есы**

**10.** На падставе самае меншае дзвюх п’ес розных аўтараў з ліку тых, што вы вывучалі, абмяркуйце, якім чынам аўтары карыстаюцца дыялогам.

**11.** Звяртаючыся як мінімум да дзвюх п’ес розных аўтараў з ліку тых, што вы вывучалі, патлумачце, якое значэнне ў іх маюць аўтарскія рэмаркі.

**12.** Абмяркуйце, якім чынам аўтары як мінімум дзвюх п’ес розных аўтараў з ліку тых, што вы вывучалі, намагаюцца паўплываць на пачуцці і погляды гледачоў.